З каталіцкіх СМІ (167)

Аўтар: Рэдакцыя
24.06.2018 00:00

“Фальшывы Папа”

Пад такой назвай у свет выйшла кніга, падрыхтаваная італьянскімі журналістамі. У ёй сабраны шэраг фальшывых звестак пра асобу папы Францішка і яго выказванні, што з’яўляліся ў СМІ. Нэлё Скава, адзін з сааўтараў, сказаў, што ідэя выдання нарадзілася пасля таго, як свет убачыла кніга “Ворагі Францішка”. У ёй расследавалася, з якім супрацівам і перашкодамі сутыкаецца Папа. Аўтары кнігі выбралі каля 80-ці асноўных абвінавачванняў у адрас Пантыфіка і правялі сур’ёзную працу па іх развянчанні.

“Мы вылучылі навіны, якія нам здаваліся найбольш цікавымі, пачынаючы з часу аргенцінскай дыктатуры і да нашых дзён. Мы бралі іх адну за другой і правяралі, прыводзячы абвяржэнне і выкрыццё”, – адзначыў сааўтар.†

У Ватыкан вярнулася
рэдкая копія ліста Калумба

Яна была выкрадзена пры невядомых абставінах і заменена на падробку. Гаворка ідзе пра 8-старонкавы ліст, які Калумб асабіста напісаў у 1493 годзе да іспанскіх манархаў, паведамляючы аб адкрыцці Амерыкі і прыродных багаццях гэтых земляў. У той час было зроблена некалькі дзясяткаў копій гэтага ліста, якія былі разасланы ў розныя часткі Еўропы.

У 2011 годзе ў Міністэрства ўнутранай бяспекі ЗША звярнуўся эксперт па старажытных кнігах і манускрыптах, які выказаў меркаванне, што ліст Калумба ў ватыканскім зборы не з’яўляецца аўтэнтычным. Праведзенае даследаванне пацвердзіла гэты факт. Пасля 7-мі гадоў пошукаў супрацоўнікі амерыканскіх спецслужб адшукалі скрадзены арыгінал.

Аўтар: Рэдакцыя
24.06.2018 00:00

